# ВЯСЕЛЬНЫ АБРАД
# У ДРАГІЧЫНСКІМ РАЁНЕ БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ
# (1920-1930-ыя гады)

**М.П. Астаповіч**

Вясельны абрад беларусаў XIX – пачатку XX ст. досыць падрабязна і грунтоўна даследаваны этнографамі і фалькларыстамі, доказам гэтаму з'яўляюцца шматлікія запісы, назапашаныя падчас экспедыцый, пісьмовыя крыніцы XIX – пачатку XX ст., апрацаваныя матэрыялы, якія змяшчаюцца ў шэрагу тамоў серыі "Беларуская народная творчасць", а таксама навуковыя распрацоўкі разнастайных аспектаў вызначанага пытання, у т.л. спецыфіка вясельнай абраднасці ў розных гісторыка-этнаграфічных рэгіёнах, і інш. Разам з тым да ліку недастаткова распрацаваных на сённяшні дзень праблем належыць пытанне аб шляхах знікнення і трансфармацыі традыцыйна-бытавой культуры беларусаў, у прыватнасці сямейнай абраднасці. З гэтай прычыны актуальны зварот да вывучэння вясельнай абраднасці ў 1920-1930-ыя гады. акрэсленая тэма дазваляе звярнуць увагу і на асаблівасці вяселля на Палессі.

Мэтай праведзенага даследавання стала вывучэнне вясельнай абраднасці вясковага насельніцтва Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці ў 1920-1930-ыя гады. Крыніцай для вызначэння характару вяселля ў вызначаным рэгіёне паслужылі матэрыялы, сабраныя аўтарам у час этнаграфічных экспедыцый (кастрычнік – лістапад 1999 г.) у Драгічынскім раёне: вёскі Пярковічы, Цігановічы, Крысцінава. Аўтарам была распрацавана спецыяльная анкета для апытання жыхароў названых населеных пунктаў. Сярод сабраных звестак найбольшую каштоўнасць для работы ўяўляюць матэрыялы, атрыманыя ад 8 інфарматараў: Якуш Г.С., Маскаленка А.А., Бяднюк В.С., Хвесюк Л.Г., Сярбун М.М., Ляшэвіч Г.А., Баран В.І., Барысюк М.А. (узрост старэйшага інфарматара - Баран В.І. - 1907 г.).

Вясельная абраднасць вясковага насельніцтва Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці ў 1920-1930-ыя гады ў асноўным яшчэ захоўвала традыцыйныя этапы палесскага вяселля, аднак не ўсе яны святкаваліся ў аднолькавай ступені поўна і ўрачыста. Застольнае вяселле ўзбагацілася некаторымі новымі стравамі, больш характэрнымі для гарадскога насельніцтва. Спецыфіку складаюць адрозненні ў выпечцы каравая, яго ўпрыгожанні, своеасаблівай з'яўлялася тэрміналогія, звязаная з вясельнымі чынамі. Танцавальныя элементы вяселля цалкам заставаліся нязменнымі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ